# Дзяржпалітыка ў смеццевай сферы беларусі для павелічэння чысціні асяроддзя і змяншэння адходаў

**Штогод у нашай краіне ўтвараецца да 60 мільёнаў тон адходаў вытворчасці. Узровень іх выкарыстання (без уліку буйнатанажных адходаў) складае каля 80 %, а традыцыйных відаў другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР), якія адносяцца да адходаў вытворчасці (макулатура, шклабой, палімерныя адходы, зношаныя шыны) — 90.%. У рэспубліцы ўстаноўлена амаль 400 тысяч кантэйнераў для ДМРдякт пасля перапрацоўваюцца. «Аднак першасная ўвага ў краіне надаецца памяншэнню стварэння адходаў як такіх і замене пластыкавай тары экалагічна бяспечнай»**

**Біяраскладанню — так, ПВХ-этыкеткам — не**

Для стварэння і забеспячэння экалагічна бяспечнага і эканамічна эфектыўнага абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі (ЦКА) і ДМР у краіне рэа- лізуецца Нацыянальная стратэгія па абыходжанні з імі, а таксама Канцэпцыя стварэння аб'ектаў па сарці- роўцы і выкарыстанні ЦКА і палігонаў для іх захавання. «Папярэджанне ўтварэння адходаў, памяншэнне іх аб'ёмаў, перапрацоўка, выкарыстанне смецця для вырабу энергіі, выканання работ і паслуг, абясшкоджванне адходаў — у выглядзе падобнай іерархіі ў праекце новага закона на абыходжанні з адходамі вызначаны асноўныя прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў смеццевай сферы», - кажуць эксперты.

У краіне зарэгістправана 1888 аб'ектаў па выкарыстанні адходаў, дзе праводзіцца ацэнка іхуздзеяння на навакольнае асяроддзе і праектна-тэхнічных умоў на прадукцыю, якая вырабляецца з адходаў. Дакументацыя на такія аб'екты падлягае дзяржаўнай экалагічнай экспертызе, — расказала ***Кацярына НЯСЦЮК, кансультайт упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ланд- шафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.***

У галіне тэхнічнага рэгулявання палімернай упакоўкі Дзяржкамітэтам па стандартызацыі за апошнія два гады распрацавана 40 дзяржстандартаў на падставе міжнародных і еўрапейскіх стандартаў у галіне вызначэння патрабаванняў да экалагічна бяспечнай упакоўкі, у тым ліку біяраскладальнай.

Праходзіць працэдура ўнутрыдзяржаўнага ўзгаднення праекта змен у тэхнічны рэгламент Мытнага саюза аб бяспецы ўпакоўкі, які вызначае па- трабаванні да ўпакоўкі, у тьш ліку палімернай. А таксами звязаныя з гэтьш патрабаванні да захоўвання, транспарціроўкі і ўтылізацыі адходаў упакоўкі,

паведаміў **Максім ТАРАСАЎ, начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды**.

У тэхрэгламент уводзіцца тэрмін «біяраскладальная ўпакоўка», якая здольная падвяргацца кампасціраванню і біяраскладанню пад уздзеяннем мікра- арганізмаў. А таксама «ўпакоўка, цалкам створаная з матэрыялаў прыроднага паходжання» (драўніны, драўнянага валакна, цэлюлозы, неламініраваных па- перы і кардону, бавоўны, джуту, ільну, пянькі, пергаменту, пергаміну і інш.).

Сярод іншых змен у тэхрэгламент — абмежаван- не на прымяненне этыкеткі з полівінілхларыду на ўпакоўцы з поліэтылентэрафталату. «Адпаведна са стратэгічнымі накірункамі развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года, каб выпрацаваць агульныя навукова-абгрунтаваныя падыходы ў абмежаванні вытворчасці аднаразовых пластыкаў, у тым ліку пакетаў, мяркуецца вывучыць пытанне

аб увядзенні паэтапнай забароны на ўвоз і вытворчасць такіх пластыкаў», - дадаў прадстаўнік Мінпрыроды.

- *Па ініцыятыве беларускага боку актыўна прасоўваецца пытанне аб магчымасці ўвядзення на пляцоўцы ЕАЭС адзінай меры нетарыфнага рэгулявання ў дачыненні да адходаў з пластмас, якія ўвозяцца на мытную тэрыторыю саюза (гэта да- зволіць кантраляваць іх колькасць і аб'ёмы). Папя- рэдне вядома, што гэтая ініцыятыва падтрымана іншымі ўдзельнікамі,* - сказаў ён.

**Мэта — 90 %**

Штогод у Беларусі ствараецца каля 4 млн тон цвёрдых камунальных адходаў (73 % з іх «выраб- ляе» насельніцтва). Сістэма абыходжання з ЦКА пастаянна ўдасканальваецца і сёння ахоплівае ўжо ўсю краіну. «Пры гэтым збор адходаў бяспечны для здароўя чалавека і наваколля», - сцвярджае **Аляксей ФІЛАНОВІЧ, начальнік аддзела водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі і добраўпарадкавання Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.**

- *Укараненне з 2012 года прынцыпу дадатковай адказнасці вытворцаў дазволіла стварыць дадатко- выя эканамічныя стымулы для павелічэння збору другаснай сыравіны за кошт частковай кампенсацыі расходаў па іх збору, а таксама стала дадатковай крыніцай інвестыцый у сістэму абыходжання з камунальнымі адходамі*, - гаворыць спецыяліст.

Летась у краіне сабралі 790 тысяч тон другас- ных матэрыяльных рэсурсаў. Па выніках мінулага года, узровень выкарыстання камунальных адходаў у Беларусі дасягнуў 31,1 % — гэта ўтрая болын, чым было дзевяць гадоў назад. Да 2025 года трэба дасяг- нуць мяжы ў 64 %, а да 2035-га — 90 %.

«Адпаведна з нацыянальнай стратэгіяй у Беларусі рэалізуецца шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на ўдасканаленне работы сістэмы абыходжання з ка- мунальнымі адходамі. За апошнія пядь гадоў на гэта накіравана каля 30 млн еўра. Мадэрнізацыя сістэмы мае на мэце пераход ад раённай сістэмы кіравання адходамі да рэгіянальнай са стварэннем 30 буйных комплексных аб'ектаў па сарціроўцы і выка- рыстанні ЦКА, кожны з якіх будзе абслугоўваць па 3-6 адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак», - удакладніў прадстаўнік ЖКГ.

— *Сёлета такія прадпрыемствы будуюцца ў Баранавічах, Оршы, Бабруйску,* - сказаў ён. - *Да 2025 года падобныя рэгіянальныя комплексы, як мяркуецца, пачнуць працаваць у Ваўкавыску і Мінску. Энергетычнае выкарыстанне адходаў будзе разві- вацца за кошт укаранення тэхналогій па спажы- ванні альтэрнатыўнага (РДФ-паліва) у цэментнай прамысловасці. Прымяненне такога віду энергіі дазволіць зменшыць колькасць адходаў, якія захоўваюцца на палігонах, а таксама знізіць спажыванне прыроднага газу, а магчыма, і цалкам замяніць выкарыстанне яго і вугалю на заводах. Тэхналагічная лінія па выкарыстанні РДФ-паліва ўведзена на заводзе «Краснаселскбудматэрыялы». У перспективе такое паліва будзе прымяняцца яшчэ на двух цэментных заводах: у Крычаве і Касцюковічах.*

Нацыянальная стратэгія мае на мэце таксама ўвядзенне тэхналогіі кампасціравання арганічнай часткі ЦКА: рэшткаў ежы і раслін. Летась у Мінску ўведзена лінія па кампасціраванні арганічных адходаў на базе прадпрыемства «Мінскзелянбуд». Эксперты лічаць, што ў выніку ўсіх гэтых мерапрыемстваў

Для сарціроўкі ЦКА і перапрацоўкі пластыка

За год у краіне ствараецца 280 тысяч гон пластыкавых адходаў (тэта прыкладна 30 «смеццевых» кілаграмаў, «вырабленых» кожным беларусам). «Для мінімізацыі вы- карыстання пластыкавай упакоўкі ў Беларусі з 2020 года рэалізуецца план з 19 мерапрыемстваў, які прадугледжвае, у прыватнасці, на- вуковыя даследаванні і асвету на- сельніцтва, а таксама выкарыстанне бяспечнай экаўпакоўкі і скарачэн- не імпарту пластыкавай тары», - нагадаў Аляксей Філановіч.

— *Да 2025 года запланавана стварэнне 16 рэгіянальных аб'ектаў па сарціроўцы і выкарыстанні ЦКА, у тым ліку па перапрацоўцы адходаў палімернай упакоўкі. Сумарная магутнасць*

*сарціровачных прад- прыемстваў складзе каля 1,2 млн тон камунальных адходаў у год, а на фінансаванне такіх комплексаў прадугледжана звыш за 1,4 млн рублёў.*

Уводзіцца ў эксплуатацыю палігон для захавання адходаў у Брэсцкай зоне абслугоўвання. Будуюцда тры рэгіянальныя аб'скты па сарціроўцы камунальных адходаў для Баранавіцкага, Аршанскага і Бабруйскага рэгіёнаў, распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя (ПКД) па Гомельскім аб'екце. Перадпраектныя і перадінвестыцыйныя дакументы ёсць для Лідскага і Пухавіцкага рэгіёнаў. На Пінскі, Полацкі і Ваўкавыскі комплексы па сарціроўцы ўжо распрацоўваецца ПКД, пачата аналагічная праца і для Магілёўскага аб'екта. «Прынята рашэнне аб будаўніцтве вытворчага комплексу па сарціроўцы ЦКА ў сталіцы з выдзяленнем ДМР, вырабам тэхнічнага грунту і РДФ-паліва», - дадаў спецыяліст.

Летась уведзены ў эксплуатацыю смеццесарці- ровачны завод у Віцебску магутнасцю 100 тысяч тон у год. На прадпрыемстве «Белдругпалімер» зай- маюцца перапрацоўкай палімерных адходаў павы- шанай забруджанасці з вырабам высакаякасных рэгранулятаў поліэтылену і поліпрапілену.

– *Пластик любога віду раскладаецца 450-500 гадоў, а адходы, якія трапляюць у глебу, змяншаюць яе ўрадлівасць і колькасцъ живых мікраарганізмаў. Толькі 12 % ад агульнага аб'ёму ўтвараемага пласты- кавага смецця спальваецца, і ўсяго 9 % — ідзе на паў- торнае выкарыстанне. Так што неабходна прымя- няць сучасныя тэхналогіі для перапрацоўкі пластыкавага смецця,* — расказаў ***Вадзім КІЦІКАУ, дырэктар Інстытута жыллёва-камунальнай гаспадаркі НАН Беларусь. —*** *Утылізацыя пластыкавых адходаў на звалках — як ні дзіўна — найбольш дарагая тэхналогія. Тэрмічпая ўтылізацыя пластику — спальванне на за- водах пры тэмпературы вышэй за 1000 °С для атрымання цеплавой ці электрычнай энергіі. Асноўная проблема такого способу — ачыстка дымовых газаў, паколькі пры спальванні пластику выдзяляюцца ды- яксіны і фураны.*

Так што, на думку экспертаў, пакуль адной з найбольш прымальных мер для барацьбы са смеццем сапраўды з'яўляецца перапрацоўіса адходаў у сыравіну і выкарыстанне іх для вырабу РДФ-паліва.